# Засваенне вучнямі пачатковых класаў правапісу *ў*



**АНТАНОВІЧ**
**Наталля Міхайлаўна**
выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка

Даныя рэспубліканскага маніторынгу па беларускай мове, праведзенага ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання ў 2011/12 навучальным годзе, сведчаць аб тым, што сярод арфаграфічных памылак вучняў пачатковых класаў «найбольш частымі з'яўляюцца памылкі на правапіс **у-ў** (дапусцілі 19,1 % навучэнцаў)» [3, с. 7]. Даныя былі атрыманы на аснове аналізу тэкставага дыктанта, напісанага вучнямі IV класаў.

Спецыяльна праведзеныя эксперыментальныя даследаванні паказалі, што вучні пачатковых класаў дапускаюць шмат памылак у правапісе **ў** у навучальных пісьмовых работах.

Як пазбегнуць памылак у правапісе ***ў***?

Чым абумоўлена свядомае засваенне і выкарыстанне правіла правапісу **ў** малодшымі школьнікамі?

З чаго пачынаецца фарміраванне навыку правапісу ***ў***?

Правіла правапісу **ў** заснавана на фанетычным прынцыпе. Паводле С. Ф. Жуйкова, арфаграфічнае дзеянне ў фанетычных напісаннях ажыццяўляецца як актуалізацыя асацыяцый наступнай структуры: «усведамленне фанетычнай сітуацыі — усведамленне гука (гукаў) — усведамленне адпаведнага знака (спалучэння знакаў) пісьма (літар)» [2, с. 13].

У сувязі з адзначаным да непасрэднага знаёмства з правілам правапісу **ў** неабходна:

- сфарміраваць уменне ўспрымаць на слых гук [ў], адрозніваць яго ад іншых беларускіх гукаў;
- сфарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [ў];
- пазнаёміць з літарай **ў**, якой абазначаецца на пісьме гук [ў].

Развіццё фанематычнага слыху, фарміраванне вымаўленчых навыкаў вучняў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання пачынаецца з I класа (вусны курс беларускай мовы).

Фарміраванне вымаўленчых навыкаў у I класе арганізоўваецца ў тры этапы [1]. Яно пачынаецца са **знаёмства з вымаўленнем асобных спецыфічных беларускіх гукаў**. Малодшыя школьнікі знаёмяцца з асаблівасцямі вымаўлення гука [ў], вучацца вызначаць яго ў слове, вымаўляць асобна, у складзе, слове.

На другім этапе фарміравання вымаўленчых навыкаў з дапамогай спецыяльна падабранага дыдактычнага матэрыялу **адпрацоўваецца вымаўленне гука [ў]** у словах, словазлучэннях, сказах. Мэтагодным з'яўляецца выкарыстанне вершаў, скорагаворак, забаўлянак, да якіх прапаноўваюцца заданні на ўдасканаленне правільнага вымаўлення гука [ў]. Настаўніку неабходна кантраляваць правільнасць вымаўлення ўсяго комплексу гукаў у маўленчай плыні.

Трэці этап выпрацоўкі вымаўленчых навыкаў заключаецца **«ў выяўленні недахопаў пры вымаўленні вывучаных гукаў, аўтаматызацыі іх вымаўлення, ажыццяўленні сама- і ўзаемакантролю вымаўленчых навыкаў у маўленчай плыні»** [1, с. 12].

З мэтай фарміравання ўменняў правільнага ўспрымання на слых, правільнага вымаўлення гука [ў] у I класе вучням можна прапанаваць наступныя гульні, займальныя практыкаванні і заданні.

➢ Гульня «Рэха». Настаўнік называе словы, а дзеці паўтараюць хорам: вяроўка, воўк, леў, лаўка, смоўж, пеўнік.

— Назавіце ў кожным слове гук, якога няма ў рускай мове.

➢ Гульня «Вялікі — маленькі».

Настаўнік называе слова, якое абазначае вялікі прадмет, а дзеці — адпаведны маленькі прадмет:

*галава — галоўка;* *дрэва — дрэўца;*
*канава — канаўка;* *трава — траўка.*

— Які гук вымаўляецца замест гука [в] у словах, якія абазначаюць маленькія прадметы? Выразна вымавіце гэты гук.

➢ Гульня «Вызнач і вымаві беларускія словы».

Настаўнік называе беларускія і рускія словы: *аўтобус, аўтобус, правда, праўда, кроў, кровь, коровка, кароўка, лев, леў.* Пасля кожнага названага слова настаўнік вытрымлівае паўзу. Калі вучні чуюць беларускае слова — вымаўляюць яго за настаўнікам.

➢ Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка вымаўляюць спалучэнні гукаў [оў-оў-оў], [ыў-ыў-ыў], [аў-аў-аў], [эў-эў-эў], [уў-уў-уў].

Затым прапаноўваецца заданне: дапоўніце словы ў чыстагаворцы неабходным спалучэннем гукаў:

*оў-оў-оў — назбіраў грыб.. .*
*ыў-ыў-ыў — потым насуш.. .*
*аў-аў-аў — суп прыгатав.. .*
*оў-оў-оў — частаваў сябр.. .*

Паслухайце скорагаворку. Назавіце словы з гукам [ў].

*— Гаў-гаў-гаў! — загаўкаў ваўкадаў.*
*Ваўкадаў, напэўна, згаладаў.* У. Скарынкін.

Настаўнік арганізоўвае шматразовае паўтарэнне скорагаворкі па асобных словах, сказах, цалкам (па радах, хорам, у парах).

➢ Паслухайце верш. Якога звера звычайна называюць царом звяроў? Які любімы занятак у цара звяроў?

*Цар звяроў*

*Што з табою, цар звяроў?*
*Ты, напэўна, не здароў?*
*Праляжаў палову дня.*
*— Спаць люблю падоўгу я.* Н. Галіноўская.

Назавіце словы з гукам [ў].

Вучні вымаўляюць словы з гукам [ў], кожны радок верша, потым увесь верш хорам.

У **ІІ класе** навучанне беларускай мове пачынаецца раздзелам **«Уступны моўны курс»**. Пры вывучэнні тэмы «Гук [ў] і яго абазначэнне на пісьме» ажыццяўляецца ўзнаўленне і ўдасканаленне навыку вымаўлення гука [ў]; фарміруецца ўменне асэнсаванага ўспрымання беларускай мовы на слых і пры чытанні; фарміруецца і адпрацоўваецца навык напісання літары **ў**; выпрацоўваецца навык чытання слоў з гукам [ў].

Для выканання вучням можна прапанаваць наступныя практыкаванні і заданні.

➢ Гульня «Знайдзі лішняе слова».

Настаўнік чытае словы, а вучні вызначаюць, якое слова лішняе і чаму.

*Траўка, трэніроўка, лаўка, вуліца, праўда.* (Лішняе слова — *вуліца*, таму што ў ім няма гука [ў].)

*Бусел, ластаўка, жаўрук, кнігаўка.* (Лішняе слова — *бусел*, таму што ў ім няма гука [ў].)

➢ Успомніце і вымавіце словы, якія пачынаюцца спалучэннем гукаў [аў]. Выразна вымаўляйце гук [ў]. *(Аўчарка, аўтобус, аўтамат, аўсянка, аўтазавод, аўтар, аўтаручка, аўторак і інш.)*

➢ Прачытайце спалучэнні літар, запісаныя ў левым слупку. Выразна вымавіце гук [ў]. Дапоўніце словы ў чыстагаворцы неабходным спалучэннем гукаў.

аў — аў-аў-аў — дзед цябе **чак..** ,
оў — оў-оў-оў — а ты не **прыйш..** ,
ыў — ыў-ыў-ыў — дзе ж, унук, ты **б..** ?
эў — эў-эў-эў — сядзеў каля **др..** ,
уў — уў-уў-уў — неўпрыкмет **засн..** .
*У. Мацвеенка.*

Дапішыце патрэбныя спалучэнні літар у выдзеленыя словы. Падкрэсліце літару **ў** разам з папярэдняй галоснай.

➢ Прачытаце словы. Спішыце, падкрэсліце літару **ў**.

*Аўторак, рукаў, хлеў.*

Якія словы «схаваліся» ў запісаных словах? Зафарбуйце іх.

➢ Прачытайце. Правільна вымавіце гук [ў]. Што абазначаюць усе гэтыя словы?

*Будаўнік, бухгалтар, настаўнік, кранаўшчык, урач.*

Выпішыце назвы прафесій з гукам [ў]. Падкрэсліце літару **ў**.

➢ Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка.

*Верабей* _______. — *спяваў*
*Жук* _______. — *ляцеў*
*Певень* _______. — *поўз*
*Шчупак* _______. — *плыў*

Запішыце апошні сказ. Падкрэсліце літару **ў**.

Непасрэдна з правілам правапісу **ў** малодшыя школьнікі знаёмяцца ў **ІІ класе** пры вывучэнні раздзела «Гукі і літары». На засваенне тэмы **«Вымаўленне і правапіс слоў з ў»** адводзяцца тры ўрокі.

Выкананне наступных практыкаванняў і заданняў будзе садзейнічаць выпрацоўцы навыку правапісу **ў**.

➢ Прачытайце назвы жывёл.

Ле.., пав..к, во..к, з..бр, кас..ля.

Спішыце словы, устаўце літару **у** або **ў**. Растлумачце іх правапіс.

➢ Прачытайце сказ.

Імя нашай настаўніцы — Я..генія ..ладзіміра..на.

Спішыце, устаўце літару **у** або **ў**. Растлумачце іх правапіс.

➢ Прачытайце. Растлумачце напісанне вялікай літары ў словах.

Барыса*(у/ў)*, Магілё*(у/ў)*, Сл*(у/ў)*цк, Шкло*(у/ў)*.

Спішыце, устаўце патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

➢ Прачытайце верш. Растлумачце правапіс першай літары ў выдзеленых словах.

*Бы(у/ў) у цырку (у/ў)чора* ***Ле(у/ў)***,
*Спадаба(у/ў)ся хлопц(у/ў)*
*На арэне* ***ле(у/ў)***. М. Пазнякоў.

Закрэсліце лішнія літары. Растлумачце свой выбар.

➢ Прачытайце. Змяніце словы так, каб яны абазначалі некалькі прадметаў. Які гук вымаўляецца ў словах замест гука [в]?

*певень — пеўні* — *салавей — салаўі*
*лівень — ліўні* — *журавель — жураўлі*

Запішыце словы, якія ў вас атрымаліся. Падкрэсліце літару **ў**.

➢ Прачытайце народную прыкмету. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы.

*Калі (у/ў) лесе шмат арэха(у/ў), але мала грыбо(у/ў), то зіма суровай і снежнай будзе.*

Закрэсліце лішнія літары. Растлумачце свой выбар.

➢ Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

*Сло.. — на мех, а спра.. — на смех.*

Дапішыце ў словы патрэбныя літары. Растлумачце іх правапіс.

➢ Прачытайце сказы. Якія літары неабходна ўставіць замест пропускаў? Ці бывае літара **ў** вялікай?

*Сястра ..льяна пайшла ў першы клас.*
*Я падрыхтаваў падарунак для брата ..ладзіка.*

Спішыце сказы. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

➢ Прачытайце тэкст. Чаму стрыжы праводзяць жыццё ў палёце?

*У стрыжо.. до..гія крылы і кароткія ножкі. З ро..-нага месца яны не могуць ..зляцець. Таму амаль ..сё жыццё праводзяць у палёце.*

Дапішыце ў словы літару **у** або **ў**. Растлумачце іх правапіс.

➢ Прачытайце тэкст. Якія літары трэба ўставіць замест пропускаў? Растлумачце.

*Празвіне.. званок. Пача..ся ..рок. Вучні ..важліва сл..хаюць наста..ніка.*

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

➢ Прачытайце жарт. Што выклікала ў вас усмешку?

*На ла..цы сядзіць м..жчына і ..важліва чытае газет.. . На тратуары засты.. яго цень. Непадалёку*

*г..ляюць хлопчык і дзя..чынка. Хлопчык паднімае нагу, намерваючыся наступіць на цень.*

*— Дзядзька, — гукае дзя..чынка, — а Міколка вам на в..ха хоча наступіць!* А. Якімовіч.

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце.

Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў тэксце? Запішыце яго.

Спішыце першы сказ. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

Выкананне наступных **займальных практыкаванняў і заданняў** таксама будзе спрыяць паспяховаму засваенню правіла правапісу **ў**.

➢ Разгадайце рэбусы. Назвы якіх птушак у вас атрымаліся? Назавіце слоўнікавае слова.




*(жаўрук)*




*(ластаўка)*




*(кнігаўка)*

Дапоўніце сказ гэтымі словамі.

__________, ____________, __________ *зімуюць у цёплых краінах.*

У запісаных словах падкрэсліце літару, якой няма ў рускай мове.

➢ Перакладзіце словы на беларускую мову і запішыце іх.

*Волк, правда, журавли, павлин.*

Які гук вымаўляецца ў беларускіх словах замест [в], [л] у рускай мове? Якой літарай на пісьме перадаецца гук [ў]?

➢ У «чароўным квадраце» знайдзіце два слоўнікавыя словы. Выпішыце гэтыя словы. У кожным слове абвядзіце літару, якой няма ў рускай мове. Які гук абазначае літара **ў**?

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| д | л | т | я | д | з | к | а |
| д | а | т | я | з | з | к | а |
| д | з | т | я | я | з | к | а |
| д | з | т | я | ў | ў | к | а |
| д | з | т | я | ч | ў | к | а |
| д | з | т | я | ы | ў | т | а |
| л | а | т | я | н | к | т | а |
| л | а | т | я | к | к | т | а |
| л | а | с | т | а | ў | к | а |

Выкарыстайце падказку і прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?



| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а | ш | с | т | а | л | ы | н | і | ц |
| д | н | а | к | ў | с | н | е | б | ь |
| с | а | л | а | в | я | о | р | о | о |

Запішыце слоўнікавае слова, якое сустрэлася ў прыказцы. Абвядзіце літару, якой няма ў рускай мове.

➢ З «рассыпаных» літар складзіце як мага больш слоў. Запішыце іх.

*в, к, с, у, б, о, т, ў, а*

Падрэсліце словы з літарай **ў**. Растлумачце правапіс **у/ў** у словах.

➢ Прачытайце словы, выразна вымаўляйце апошні гук. Растлумачце правапіс **ў** у словах.

*Адказаў, прачытаў, думаў, маляваў, выканаў.*

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі, каб атрымалася рыфма:

*Вучань гучна __________:*

*— Я заданне ____________!*

Фарміраванне навыку правапісу **ў** працягваецца пры вывучэнні розных тэм. Напрыклад, пры знаёмстве з **правіламі пераносу слоў** вучням II класа можна прапанаваць наступныя практыкаванні, якія будуць садзейнічаць адпрацоўцы навыку правапісу **ў**.

➢ Прачытайце назвы птушак. Якія літары трэба ўставіць замест пропускаў? Чаму?

*Цецяр..к, ласта..ка, б..сел, карш..н, ж..равель, кніга..ка.*

Запішыце словы, падзяліце іх рысачкамі для пераносу.

➢ У «ланцужку» складоў знайдзіце словы.

а – лоў – кі – раў – нік – ся – броў – ка – роў – ка – аў – то – бус

Запішыце словы. Падзяліце іх для пераносу.

➢ Прачытайце. Якія літары трэба ўставіць замест пропускаў? Растлумачце.

*Гарб..з, цыб..ля, аг..рок, боб, морква, кроп, кав..н, шча..е, памідор.*

Ці ўсе словы можна падзяліць для пераносу? Чаму?

Запішыце словы, якія можна падзяліць для пераносу. Рысачкамі падзяліце іх для пераносу.

➢ Прачытайце скорагаворку. Растлумачце, якія літары неабходна ўставіць замест пропускаў. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць скорагаворку.

*Ло..ка Лё..ка*
*Малява.. ало..кам*
*У аблоках самалёты,*
*У якіх ляцяць пілоты.*
А. Котава.

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Падзяліце іх для пераносу.

➢ Прачытайце верш. Чым сасонка нагадвае дзяўчынку?

*Сасонка грэецца .. сняжку,*
*Нібы дзя..чынка .. кажушку.*
*У снежным футры верхавінка*
*І залацістыя сукі.*
*Не мерзне белая дзя..чынка,*
*Хоць і марозныя дзянькі.*
Е. Лось.

Якую літару неабходна ўставіць (***у*** або ***ў***)? Растлумачце.

Выпішыце слоўнікавае слова, падзяляючы яго для пераносу.

Такім чынам, да непасрэднага знаёмства з правілам правапісу ***ў*** неабходна, каб у вучняў былі сфарміраваны ўменні ўспрымаць на слых і дыферэнцыраваць гук [ў] у маўленчай плыні, правільна вымаўляць яго і перадаваць адпаведнай літарай на пісьме. Навык правапісу ***ў*** выпрацоўваецца пастулова, у працэсе выканання сістэмы практыкаванняў і заданняў на працягу ўсяго перыяду навучання ў пачатковых класах.


**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. *Антонава, Н. У.* Беларуская мова ў 1 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання / Н. У. Антонава, Г. А. Галяш. — Мінск : НІА, 2010. — 192 с.
2. *Жуйков, С. В.* Формирование орфографических действий (у младших школьников) / С. В. Жуйков. — М. : Просвещение, 1965. — 355 с.
3. Мониторинг уровня обученности по учебным предметам // Веснік адукацыі. — 2012. — № 8. — С. 5–37.


# Скланенне прыметнікаў жаночага роду




**СВІРЫДЗЕНКА Вольга Іванаўна**
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка


Пры вывучэнні скланення прыметнікаў жаночага роду мэтазгодна захаваць наступную паслядоўнасць:

1) пазнаёміць вучняў са скланеннем прыметнікаў жаночага роду ўвогуле;

2) спыніцца на адрозненні ненацікных канчаткаў ***-ая, -яя*** ад сугучных ім канчаткаў прыметнікаў ніякага роду ***-ае, -яе*** (назоўны склон);

3) параўнаць канчаткі прыметнікаў у родным, давальным і месным склонах;

4) супаставіць канчаткі вінавальнага і творнага (двухскладовы варыянт) склонаў.

Знаёмства са скланеннем прыметнікаў жаночага роду можна пачаць з аналізу табліцы.

Працуючы з ёй неабходна звярнуць увагу вучняў на тое, што прыметнікі жаночага роду:

а) маюць аднолькавыя канчаткі ў формах роднага, давальнага і меснага склонаў;

б) маюць два варыянты канчаткаў (аднаскладовы і двухскладовы варыянт) у форме творнага склону.

Пасля агульнага знаёмства са скланеннем прыметнікаў жаночага роду важна спыніцца на адрозненні ненацікных канчаткаў ***-ая, -яя*** ад сугучных ім канчаткаў прыметнікаў ніякага роду ***-ае, -яе*** ў назоўным склоне. Каб патрэніраваць вучняў у адрозніванні ненацікных канчаткаў прыметнікаў жаночага і ніякага роду ў назоўным склоне, можна прапанаваць вучням выканаць наступныя практыкаванні.

| Склоны | Пытанні | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Назоўны** | як**ая**? | **добрая** бабуля | **сіняя** сукенка | **дарагая** рэч |
| **Родны** | як**ой**? | **добрай** бабулі | **сіняй** сукенкі | **дарагой** рэчы |
| **Давальны** | як**ой**? | **добрай** бабулі | **сіняй** сукенцы | **дарагой** рэчы |
| **Вінавальны** | як**ую**? | **добрую** бабулю | **сінюю** сукенку | **дарагую** рэч |
| **Творны** | як**ой**? | **добрай(-аю)** бабуляй | **сіняй(-яю)** сукенкай | **дарагой(-ою)** рэччу |
| **Месны** | як**ой**? | пры **добрай** бабулі | у **сіняй** сукенцы | у **дарагой** рэчы |